Філосаф, аднак, павінен быў бы ведаць, што ён ніяк не больш богападобны, чым усякі іншы чалавек» [2, с. XVI]. – (Пераклад мой. – *А. Б.*).

Такім чынам, дыялагізацыя адукацыйнага працэсу выступае як надзвычай дзейсны спосаб актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх адпаведных кампетэнцый. Не ў меньшай ступені гэта датычыць і іх падрыхтаванасці да жыцця і дзейнасці ў грамадстве ў рамках пэўных грамадскіх структур. Відавочна, што здзяйсненне дыялагічных прынцыпаў у сферы адукацыі можа адбывацца празнымі шляхамі, і можна спадзявацца, што рэальнае разгортванне адпаведных практык выявіць новыя эфектыўныя і цікавыя спосабы іх арганізацыі, а таксама дазволіць удасканаліць тыя, што былі разгледжаны вышэй.


1. *Malpas, J.* Hans-Georg Gadamer [Electronic resourse] / J. Malpas // The Stanford Encyclopedia of Philosophy ; Edward N. Zalta (ed.). – Mode of access : http://plato.stanford.edu/archivs/sum2015/entries/gadamer/. – Date access : 04.07.2015.

2. *Popper, K. R.* Logik der Forschung / K. R. Popper. – 10. Aufl. – Tübingen : J.C.B. Mohr (Paul Siebeck), 1994. – XXIX, 481 s.

3. *Schäfer, K.* Paradox / K. Schäfer // Handbuch philosophischer Grundbegriffe / hrsg. von H. Krings, H.-M. Baumgarten, C. Wild : in 6 B. – München : Kösel-Verlag, 1974. – Bd. 4. – S. 1051–1059.



**У. Ф. Красюк,**
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*


## МАРАЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ З ПАЗІЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ

Далучэнне Беларусі да Балонскага працэсу ставіць пытанне аб кампетэнтнасным падыходзе як сродку ўдасканалення сістэмы адукацыі і падрыхтоўкі якасных спецыялістаў. Згодна з пастаўленай задачай будучы спецыяліст павінен быць усебакова падрыхтаваным да жыцця. Гэта значыць, не толькі валодаць назапашанымі ведамі, але і ўмець ставіць перад сабой мэты, рабіць самастойны выбар, вырашаць праблемы, несці адказнасць за іх вырашэнне. У сучасным няўстойлівым свеце



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйныя і сацыяльна-вытворчыя сувязі патрабуюць умення быць не толькі вузкім знаўцам прафесійных задач, але і асобай, якая можа быць гаспадаром свайго жыцця. Сярод іншых кампетэнцый у гэтым плане важнае месца належыць фактару духоўнасці, этычнай састаўляючай.

Калі кампетэнтнасць – гэта агульны ўзровень здольнасцей ці кваліфікацый, што дэманструе асоба, то кампетэнцыя – ёсць узровень прызнання звонку яе прэтэнзій на гэту дэманстрацыю. Акрамя прафесійных якасцей асобы тут важную ролю адыгрывае этычны аспект – маральнае права на прызнанне выпрацаванага прафесійнага і творчага патэнцыялу і, адначасова, згоду саслужыўцаў пацвердзіць здольнасці і талент прэтэндэнта.

Наяўнасць ведаў – аснова кампетэнтнасці. Аднак тэарэтычная, навуковая кампетэнтнасць – не самі веды, а ўменні і навыкі іх засвойваць, здабываць і выкарыстоўваць. Без духоўнай састаўляючай, без маральнага самаўсведамлення і самаадчування неабходнасці пашырэння сферы ведаў тут не абысціся. Менавіта этычнае перакананне ў неабходнасці творчага, а не стандартнага засваення ведаў і надае гэтым ведам значнасць у агульным працэсе станаўлення будучага спецыяліста як асобы самастойна думаючай, умеючай, падрыхтаванай да жыцця. Таму крэатыўная кампетэнтнасць – гэта маральна абумоўленая здольнасць набываць, засвойваць і трансфармаваць крэатыўныя веды, кампетэнцыі, якія звязаны з іх рэалізацыяй у прафесійна-практычнай дзейнасці. Для далейшага развіцця беларускай культуры сёння немалаважнае значэнне мае моўная кампетэнцыя як усеагульнасць лінгвістычных ведаў роднай мовы, здольнасць эфектыўна і змястоўна выкарыстоўваць яе структуры ў прафесійнай дзейнасці.

Падрыхтоўка будучых спецыялістаў, зразумела, не ёсць набыццё ведаў дзеля ведаў, а дзеля іх рэалізацыі на практыцы. Па словах спецыялістаў, «кампетэнцыі засноўваюцца на ведах, канструююцца праз вопыт, рэалізуюцца на аснове волі» [1, с. 38]. У гэтым працэсе сродкамі рэалізацыі прафесійных якасцей выступаюць міжасобасных кампетэнцыі. Іх сутнасць – у веданні і камунікатыўных здольнасцях міжасобаснага ўзаемадзеяння, якое з’яўляецца элементам сацыяльнага і культурнага жыцця соцыуму. Службовая этыка, этыка дзелавых зносін рэпрэзентуюць кампетэнцыі маладых спецыялістаў у іх запатрабаванасці і значнасці.

Гісторыя ведае нямала прыкладаў, калі незвычайныя па здольнасцях людзі не маглі рэалізаваць свае таленты з прычыны непаразумення з навакольным культурным асяроддзем. Іх не разумелі па-рознаму. Адной з прычын было няўменне рэпрэзентаваць свой інтэлект. Ніхто не адмаўляе яго значнасці, «інтэлект з’яўляецца гарантам і рэгентам прафесійнай кампетэнтнасці, якая фарміруецца і развіваецца» [2, с. 60]. Але сутнасць новай парадыгмы – не інтэлект, а кампетэнтнасць [2, с. 54]. Дададзім, кампетэнтнасць, насычаная трывалым духоўна-этычным зместам.

У адукацыйных стандартах вышэйшай адукацыі новага пакалення, якія рэалізуюцца ва УВА Рэспублікі Беларусь з 2008/09 навучальнага года, кампетэнтнасны падыход з’яўляецца галоўнай інавацыйнай асаблівасцю. У якасці мэт падрыхтоўкі выпускнікоў універсітэтаў, акрамя акадэмічных і прафесійных кампетэнцый, значнае месца належыць сацыяльна-асобасным кампетэнцыям. Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне і практыкаванне маральных каштоўнасцей. Асноўным напрамкам набыцця студэнтамі такіх арыентацый выступае вывучэнне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. У першую чаргу гэта філасофскія навукі, сярод якіх у плане фарміравання маральна-светапоглядных якасцей важнае месца займае этыка. У значнай меры гэтай справе садзейнічаюць і іншыя дысцыпліны – «Гісторыя Беларусі», «Педагогіка» і інш.

Патрабаванні і напрамкі дадзенай работы закладаюцца ў вучэбных праграмах сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, якія фарміруюцца ў кампетэнтнасным падыходзе. Там змяшчаецца кола сацыяльна-асобасных кампетэнцый, у складзе якіх выдзяляюцца прэрагатывы маральных якасцей. Гэта арыентуе на аптымальны алгарытм арганізацыі навучальнага працэсу. Пры гэтым кампетэнцыі маральна-духоўнага парадку дапаўняюцца іншымі кампетэнцыямі, што адпавядае сістэмнаму падыходу да працэсу навучання.

Сярод сацыяльна-асобасных кампетэнцый, якія прасякнуты этычнымі якасцямі і крытэрыямі, можна выдзеліць наступныя: валоданне якасцямі грамадзянскасці; здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння; валоданне здольнасцю да міжасобасных камунікацый; валоданне навыкамі здаровага ладу жыцця; схільнасць да самакрытычнага асэнсавання сваіх маральна-псіхалагічных якасцей; уменне працаваць у калектыве, раскры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваць свой патэнцыял, прызнаючы такое ж права за іншымі. Найважнейшай кампетэнцыяй з'яўляецца ўменне самастойна прымаць сэнсажыццёвыя рашэнні з усведамленнем свайго маральнага права на самараскрыццё.

Кампетэнцыі, якія студэнты набываюць падчас навучання, даюць эфект толькі тады, калі будучы спецыяліст адчувае ўнутраную духоўную патрэбу ў іх рэалізацыі з максімальнай аддачай, з перакананасцю ў неабходнасці адэкватнага выканання сваіх абавязкаў. Прыхільнасць да этычных каштоўнасцей раскрываецца ў такіх сферах дзейнасці, як здольнасць працаваць у камандзе, здольнасць да крытыкі і самакрытыкі, валоданне навыкамі міжасобасных адносін у канфліктных сітуацыях, уменне наладжваць стасункі са спецыялістамі іншых напрамкаў, здольнасць кантактаваць з супрацоўнікамі, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі іншых культур, праяўленне крэатыўнасці і ініцыятыўнасці.

Уваходжанне Беларусі ў Балонскі працэс выклікае неабходнасць вырашэння шэрагу праблем. Вырашаць іх будуць не толькі кіруючыя структуры, адказныя за прававыя і адміністрацыйныя рашэнні, але і студэнты, і выкладчыкі. Маральныя кампетэнцыі студэнцкай масы праявяцца ў пазіцыі кожнага студэнта, які павінен засвоіць неабходныя этычныя нормы, каб быць адказным за змястоўнасць сваёй вучэбнай дзейнасці, прафесійнай падрыхтоўкі. Калі акрэсліцца індывідуалізацыя адукацыі, то ўзровень самастойнай работы значна павысіцца, як павысіцца і сфера студэнцкага самакіравання. «Студэнт сам фарміруе свой індывідуальны план на вучэбны год... студэнт пры састаўленні свайго вучэбнага плана мае пэўную свабоду выбару дысцыпліны...» і г. д. [1, с. 13]. Такая самастойнасць патрабуе канкрэтнай маральнай гатоўнасці, дакладных духоўных якасцей (яны вядомы як агульначалавечыя) і спецыяльных, якія патрэбны будучаму спецыялісту. Назавём некаторыя з іх, найперш тыя, якія дазволяць выключыць рознага роду недарэчнасці, злоўжыванні і памылкі падчас працоўнага працэсу і ўзаемадзеяння з будучымі калегамі: творчы падыход да справы; ініцыятыўнасць; персанальная адказнасць; сумленныя адносіны да сваёй справы; уменне карэктна адносіцца да пазіцыі калег, паважаць іх гонар і годнасць; уменне працаваць з інфармацыяй, прызнаваць значнасць інавацый; добразычлівасць у калектыве павінна спалучацца са строгай патрабаваль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцю; арганізаванасць; дысцыплінаванасць; калегіяльнасць; іншыя агульназначныя духоўныя якасці, якія характарызуюць пазіцыі кіраўнікоў і супрацоўнікаў.

Адсутнасць адпаведных маральных кампетэнцый вядзе да фарміравання негатыўных аспектаў узаемадзеяння ў калектыве. Яны добра вядомыя: няўменне кантактаваць з калегамі; неапраўданыя засмучэнні; незадаволенасць; пачуццё крыўды, адзіноты; нервознасць, прэтэнзіі і высненне адносін.

Як раней, так і ў сучаснай сацыяльнай інфармацыйнай прасторы вялікае значэнне маюць асаблівасці псіхалагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў да сумеснай працы. Гэта тэма асобнай размовы, аднак толькі зазначым, што эмацыянальна-псіхалагічны складальнік выступае найважнейшым кампанентам сацыяльна-духоўнага працэсу функцыянавання працоўнага калектыву. Сацыяльна-псіхалагічны клімат ёсць вынік сумеснай дзейнасці людзей, іх міжасобаснага ўзаемадзеяння. Ён праяўляецца ў такіх групавых эффектах, як настроі і меркаванні калектыву, індывідуальнае самаадчуванне і ацэнка ўмоў жыцця і працы асобы. Набываючы неабходныя прафесійныя кампетэнцыі для будучай працоўнай дзейнасці, студэнцкая моладзь павінна засвоіць, што гэтыя эфекты раскрываюцца ва ўзаемаадносінах, якія звязаны з працэсам працы і рашэннем агульных задач калектыву.

Падводзячы вынік, хацелася б зазначыць, што фарміраванне адпаведных прафесійных кампетэнцый, у тым ліку іх духоўна-асобасных, маральных асаблівасцей у поўнай меры адбываецца ў працэсе рэальнага жыццёвага вопыту, працоўнай дзейнасці, выканання службовых абавязкаў. Задачай вышэйшай школы з'яўляецца змястоўная падрыхтоўка будучых спецыялістаў да выканання сваіх абавязкаў, што адбываецца ў першую чаргу ў працэсе навучання, набыцця ведаў, вывучэння адпаведных вучэбных дысцыплін. Заняткі па «Этыцы», «Філасофіі», «Псіхалогіі», «Сацыялогіі», «Педагогіцы», «Культуралогіі» і інш. дысцыплінах даюць студэнтам кірунак у напрамку духоўнага сталення.

---


1. *Зданович, В. М.* Правовые основы организации профессионального образования в Республике Беларусь / В. М. Зданович. – Минск : РИВШ, 2011. – 102 с.

2. *Лобанов, А. П.* Интеллект. Компетентность. Образование: Кто стоит напротив Белой Вежи / А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова. – Минск : РИВШ, 2013. – 102 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ